№ 77. 7 listapada 1916 h. Cena 5 fen. (3 kap.)

HOMAN

BIEŁARUSKAJA WIŁEŃSKAJA CZASOPIŚ

WYCHODZIĆ DWA RAZY U TYDZIEŃ: U AUTORKI I U PIATNICY.

Cena s pierasyłkaj i dastaŭkaj da chaty: na 1 hod—4 m. 80 fen., na ½ hodu—2 m. 40 f., na 3 miesiacy—1 m. 20 f., na 1 mies.—40 f.

Adres redakcii: Wilnia, Zawalnaja 7.
Adres administracii i ekspedycyi: M. Stefanskaja 23.

TELEHRAMY.

2 listapada.

Zachodni teatr:

Front Ruprechta Bawarskaho: U doŭhaj batalii na Sommie 5 listapada byŭ iznoŭ wialiki bajewy dzień. Anhliczanie i francuzy nadta wialikimi siłami, s padmohaj usiej swajej artyleryi. zrabili mahutny udar proci frontu armii Belowa. Wojski roznych niamieckich plamion udzieržalisia stojka i zrabiŭszy woraham ciažkije straty. Na całym fronci blizka na 20. kil. szyrokim ad Lesar da Bussaweń złuczenyje worahi mieli strašeńnie wialikije krywawyje straty i, nia liczuczy miejscowaj udaczy ŭ paŭnocznaj czaści lesu L-Pjer Wast, niczoha nie dajszli. Dzie worahам udawałosia dachadzić da naszych linij, my ich ŭraz-že wykidywali adtul nazad. Jany pakinuli ŭ naszych rukach 10 aficeroŭ, 310 sałdatoŭ i inszuju dabyczu. Na paŭnocznym uschodzi ad Lesar uziaty 70 pałonnych i 11 kulemiotoŭ. Pry Soason ataka wialikaho francuskaho atradu adbita.

Front niamieckaho Naślednika: Naprawo ad Maasu, na adrezku Hardowon, wostryje bitwy artyleryi i na ruczuyje hranaty.

Uschodni teatr:

Front Leopolda Bawarskaho: Biez wydatnych prypadkoŭ.

Front erc-hercoga Karola: Bitwy na adrezku Teldjes i miž prachodami Alt-Szanc i Bodža trywali biez znacznych źmien. Na pałudziennym zachodzi ad Predeal my zdabyli wiarszynu La Omu i na ŭschodzi ad prachodu Czyrwonaj Baszni dajszli dalejszaj udaczy. Na pałudziennym fronci my ŭziali 450 pałonnych.

Bałkanski teatr:

Niczoha nowaho.

Adbudowa Polszczy.

WARSZAWA (W.T.B.). 5.XI. U Belwederskim zamku ad 11 hadz. paczali zježdžacca hości na wialikaje światkawańnie, naznaczenaje na 12 hadz. Na hetym byli 3000 studentoŭ i byŭszyje ŭ Warszawi legionery. U kołonnaj sali sabraŭsia hieneralitet i wyszejszyje uradowyje asoby. Proci miejsca hienerał-hubernatara stanuŭ warszaŭski arcybiskup, naprawo — prezydent miesta, nalewo—zastupnik kamendanta polskaho legiona. Dalej — troje jeszcze žywych prafesaroŭ b. Hłaŭnaj Szkoły, zakrytaj ŭ 1869 hadu, i niekolki weteranoŭ paŭstańnia 1863 hodu. Roŭna a 12 hadzinie wyjszoŭ hienerał-hubernatar, kab praczytać užo wiadomuju adozwu, katoruju paśla paŭtaryŭ pa polsku hraf Hutten-Czapski. Marszałak miestowaj rady, prafesar Brudzinski, u doŭhaj pramowi, wyzwaŭszaj haraczyje owacii, wykazaŭ padziaku Polszczy.

Jaho ekcelencija v. Beseler skazaŭ:

«Dla ciažkaha sumleńnia: szto budzie z nami dalej? — u polskich sercach bolsz nima miejsca. Wam dadziena nowaja wialikaja meta Z dawierjem stańcie na naszaj staranie, kab dawiaści zmahańnie da szczaśliwaho kanca i supolnaj pracaj pałažyć najlepszuju asnowu dla Polskaho Karaleŭstwa, naradziny katoraho my ciapier spraŭlajem. Słowo pawažnych sajuznych monarchoŭ zabaspieczywaje Wam buduczynu».

Orkiestr trubaczoŭ zaihraŭ polski nacyonalny hymn «Boże, coś Polskę». U toj že moment zamkowaj baszni i na ŭsich rohach byli wywieszeny polskije sztadary.

Jeduczy z zamku, v. Beselera narod horacza witaŭ i rabiŭ jamu owacii.

Paszyreńnie prau Haliczyny.

WIENA. „Wiener Ztg.“ drukuje reskrypt Imperatara na imia Körbera, ŭ katorym, uspaminajuczy abjaŭleńni niezaležnaści Polszczy, ministru-prezydentu predłahajecca apracawać prajekt zakona, „kab i Haliczynie dać prawo niezaležna u poŭnaj miery wiaści swaje ziemskije sprawy, paskolku hetkaja czynnaść zhodna z jednaściu i dabrabytam usiaho hasudarstwa“.

Z aposznich dzion:

Niamieckije apawieszczeńnia.

3.XI. Zachodni teatr:

Front Ruprechta Bawarskaho: Bajewaja rabota, naahuł, wyjaŭlałasia miarkoŭna. U wakolicach Sommy na paadzinokich adrezkach—silny ahoń artyleryi. Zdabytyje nami damy ŭ Saji my ŭczora utracili paśla bitwy z bliskaj adlehłaści. Ataki worahoŭ na ŭschodzi ad Gedekur i proci ŭschodniaj czaści lesu St.-Pjer Wast nie ŭdalisia.

Francuski ahoń, kirawany na front Wo, u wieczary asłabieŭ.

Uschodni teatr:

Front Leopolda Bawarskaho: Niezwyczajna wialikije straty mieli rasiejcy pry swaich siami daremnych sprobach adabrać zdabytyje nami szturmam 30. kastrycznika pazycii na zachodzi ad linii Fołow—Krasnalesje, na-lewo ad Narajoŭki.

Front erc-hercoga Karola: Na siemihradzkim i pałudziennym fronci rumynskije ataki adbity ahniom abo sztykami. Na pałudziennym zachodzi ad Predeal i na pałudziennym uschodzi ad prachodu Czyrwonaj Baszni my paczali nastupać i ŭziali bolsz 350 rumynoŭ u pałon.

Bałkanski teatr:

Biez wydatnych prypadkoŭ.

4.XI. Zachodni teatr:

Front Ruprechta Bawarskaho: Wostraja artyleryjskaja bitwa papiaredziła ataki worahoŭ, katoryje pad naszym ahniom razwinulisia tolki czaściu, — naprykład na adrezku Gedekur—Lebef i pry Kurselet. Jany adbity.

U bitwach na pawietry i zaszczytnym ahniom zbity 9 samalotoŭ worahoŭ.

Front niamieckaho Naślednika: Proci naszych pazycij na wiarszynach na ŭschodzi ad Maasu ahoń artyleryi worahoŭ pa-abiedzi uzmacawaŭsia. Francuskije nastupleńnia miž Duomon i Wo niczoha nie dajszli.

Uschodni teatr:

Front Leopolda Bawarskaho: Naszy udaczy na prawo ad Narajoŭki paszyrylisia i umacowany, nia hledziaczy na sproby adwajewać ich. Pry hetym my ŭziali szturmam dalejszyje czaści rasiejskaj hłaŭnaj pazycii na pałudziennym zachodzi ad folwarku Krasnalesje.

Front erc hercoga Karola: U paŭnocznaj czaści uschodniaho frontu bajewaja rabota iznoŭ ažywiłasia, choć bolej-mieniej surjoznych pieszych bitw nie było. Na pałudziennym fronci adbity paadzinokije rumynskije ataki. Wiarszyna Roska, na pałudziennym uschodzi ad prachodu Alt-Szanc, zaniata worahami. Na pałudziennym zachodzi ad Predeal my iznoŭ zdabyli rumynskuju pazyciju, zdabytuju ŭžo 2 listapada, ale nazaŭtra ŭ naczy utraczenuju. U naszy ruki papało bolsz za 250 pałonnych.

Bałkanski teatr:

Front Makienzena: Pry operacii aŭstryjackich monitoroŭ proci adnaho ostrawa na Dunai, na pałudziennym zachodzi ad Ruszczuka, zdabyty 2 harmaty i 4 minamioty.

U Dobrudžy biez znacznych prypadkoŭ.

Makiedonski front: Pałažeńnie biez pieramien.

5.XI. Zachodni teatr:

Front Ruprechta Bawarskaho: Paszyrajuczysia na front Ankr, artyleryjski ahoń na poŭnaczy ad Sommy dajszoŭ wialikaj siły. Miejscowyje ataki worahoŭ na ŭschodzi ad Ankr, na poŭnaczy ad Kurselet, pry Gedekur i na paŭnocznym zachodzi ad Saji adbity.

Front niamieckaho Naślednika: Na uzmacawany za aposzni czas abstreł wakolic za naszym frontam u Szampani, nie pakinutych nasialeńniem, my atkazali ŭczora abstrełam Rejmsu. Na-prawo ad Maasu — miejscowyje wostryje bitwy artyleryi.

Uschodni teatr:

Front Leopolda Bawarskaho: Dobra pryhatawanaja niewialikaja operacija paswoliła nam biez wialikich strat zaŭładać wioskaj Možejki, na ŭschodzi ad Hoduciszak. Worahi pakinuli ŭ naszych rukach bolsz za 60 pałonnych, niekolki kulemiotoŭ. Ahulnaje pałažeńnie — biez pieramien.

Kaniec telehram na 3 i 4 stranicy.

Niezaležnaść Polszczy.

Manifest ab adbudowie karaleŭstwa Polszczy my ŭ niezwyczajnym dadatku apawieścili ŭžo ŭ niadzielu. Dla naszych czytaczoŭ za miežami Wilni my drukujem manifest z zamietkaj da jaho jeszcze raz.

Z WARSZAWY telehrafujuć:

Da žycharoŭ Warszaŭskaho Hienerał-Hubernatarstwa.

Jaho Wialiczestwo Niamiecki Impieratar i Jaho Wialiczestwo Impieratar Aŭstryi, Apostalski Karol Wenhryi, kirujuczysia ćwiordaj wieraj u kanieczuuju pieramohu swajho aružža i žadańniem wiaści na-sustrecz szczaśliwaj buduczynie Polski Kraj, wyrwany ich adważnymi wojskami s ciažkimi achwiarami s-pad rasiejskaho panawańnia, zhodzilisia na tym, kab z hetych ziamiel stwaryć niezaležnuju dzieržawu z dziedziczasnaj monarchijej i konstytucyjnym ładam. Akuratnaje wyznaczeńnie hranic Karaleŭstwa Polszczyny adbudziecca paźniej. Nowaje Karaleŭstwo, pryłuczajuczysia da abiedźwych sajuznych dzieržaŭ, znojdzie paruku, patrebnuju jamu dziela wolnaho razwiccia swaich sił. U jaho armii buduć dalej žyć słaŭnyje tradycii polskich wojsk z daŭnych czasoŭ i ŭspaminy ab adważnych polskich papłecznikach z wialikaj wajny ciapierasznaho czasu. Jaje ład, szych i kiraŭnictwo buduć narychtawany z ahulnaj zhody. Sajuznyje monarchii majuć poŭnuju nadzieju, szto žadańnie dzieržaŭnaho i nacyonalnaho razwiccia Karaleŭstwa Polszczy ciapier budzie spoŭnieno z naležnaj uwahaj na ahulnyje palityczuyje warunki Eŭropy i na dabrabyt i baspiecznaść ich ułasnych ziamiel i narodoŭ. A susiednije s Karaleŭstwam Polszczaj wialikije zachodnije dzieržawy z radaściu buduć baczyć na swajej uschoduiaj hranicy budowu i rasćwiet wolnaho, szczaśliwaho i radaho sa swajho nacyonalnaho žyccia hasudarstwa.

Pawodłuh Najwyszejszaho Zahadu Jaho Wialiczestwa Niamieckaho Impieratara

Hienerał-Hubernatar

v. Beseler.

Wyszejpisany manifest daje razwiazku buduczyny nacyonalna-polskich ziamiel, katoryje raniej byli pad panawańniem Rasiei. Pytańnie ab buduczynie litoŭskich žycharoŭ manifestam nie zakranuto: jano budzie razwiazano tolki paźniej. Adnak, fakt, szto pad niamieckaj okupacijej naładženo upraŭleńnie Litwy, jasna pakazwaje, szto Niamieczczyna chocze zachawać i spahadliwa adnasiccä da asobnaści litoŭskaho nasialeńnia. Niamieczczyna kirujecca da wolnaho razwiccia i sprawiadliwaho adnaszeńnia da ŭsich narodoŭ. Kali litoŭskaje nasialeńnie budzie uhledacca na hety pryncyp, pastaŭleny nia tolki ŭ teoryi, ale i staranna stasawany ŭ praktycy niamieckaho okupacyjnaho upraŭleńnia, — to jano pryjmie da swajho wiedama ciapierasźniuju pastanowu pryniatuju dziela adbudowy aŭtonomnaho Polskaho hasudarstwa z rasiejskich nacyonalna-polskich ziamiel, nie turbujuczysia ab swaim ułasnym szczaśliwym razwicci.

Zajawa litwinoŭ.

„Dabartis“ danosić, szto francuski urad zwiarnuŭsia da litoŭskich kamitetoŭ u Ameryce s prośbaj pasłać u Franciju 10.000 rabotnikoŭ-litwinoŭ u fabryki amunicii, kab hetak možna było zwolnić i pasłać u armiju adpawiednaje czysło rabotnikoŭ-francuzoŭ. Nia hledziaczy na toje, szto francuzy sulili litwinom nadta wyhodnyje warunki, amerykanskije litwiny adkazali, szto jany dla sajuźnicy Rasiei pracawać nia buduć.

Stanowiszcze rabotnikou.

U piatnicu, 3 listapada, ŭ wialikaj sali Rabotnickaho Klubu adbyŭsia schod wilenskich rabotnikoŭ, sabraŭszy paru tysiacz dusz. Schod hety uładziło centralnaje biuro rabotnickich prafesyonalnych sajuzoŭ dziela propahandy orhanizacii rabotnikoŭ.

Daŭno Wilnia nia baczyła hetkaho ludnaho schodu, katory prypaminaŭ saboj znamienityje mityngi 1905 hodu. Na schodzi aratary, pramaŭlajuczy ŭ biełaruskaj, litoŭskaj, polskaj i žydoŭskaj mowach, wyjaśniali patrebu i zadaczy rabotnickich orhanizacij i patrebu jednaści rabotnikoŭ ŭsich krajowych nacij. Pakazywali na toje, szto paśla kanca wajny ekonomicznaje pałažeńnie rabotnikoŭ budzie duža ciažkoje: ceny praduktoŭ nie pamienszacca, a fabrykanty, puskajuczy nanowa ŭ chod swaje fabryki, parupiacca ab toje, kab płacić rabotnikam czym nižejszyje ceny. I rabotniki, majuczy pierad saboj surjoznaje zmahańnie za swoj byt, pawinny zahadzia orhanizawacca. Pry hetym u nas, dzie pad maskoŭskaj apiekaj hetak bujna usraśli ŭsielakije nacyonalizmy, dzie i ciapier jość elementy, katoryje wiaduć niahodnuju rabotu ckawańnia adnej nacii proci druhoj, — u nas treba asabliwuju wahu zwiertać na jednaść rabotnikoŭ ŭsich nacyonalnaściej.

Szczyra witajem hety klicz da jednaści ŭsich pracaŭnikoŭ na naszaj ziamli — biaz roznicy nacii i wiery: ŭ hetkaj jednaści — asnowa dalejszaj szczasnaj doli Kraju, asnowa jaho rasćwietu, asnowa wyzwaleńnia ŭsich rabotnikoŭ ad ucisku kapitału. Wierym, szto rabotniki najlepiej zdalejuć prawodzić u žyccio ideju bractwa, jednaści i woli ŭsich ludziej i ŭsich narodoŭ.

H. B.

U Wilni i wakolicach.

× **Pamažycie dzieciam!** Iduć užo chałodnyje dni, i skora śnieh pakryje ziamlu. Hety czas—samy bahaty chwarobami, katoryje asabliwa prystajuć da dziaciej, tym bolej, kali jany drenna kormiacca i kiepska adzioty.

Biełaruskaje T-wo pom. pac. ad wajny ŭ Wilni maje pad swajej apiekaj kala 200 biednych dziaciej, katorych wuczyć i kormić biez nijakaj płaty. Ale Tawarystwo—lisz nie biednaje, kab dać dzieciam i adziežu. Praŭda, jano zakupiło dla ich bociki, ale na wierchniuju opratku hroszy nima.

Nichaj že wilenskaje hramadzianstwo parupicca ab biednych dziaciej, nichaj ludzi, ŭ katorych jość liszniaja, niepatrebnaja ciopłaja adzieža, achwiarujuć jaje dla tych, chto zusim nia maje ŭ-wa szto apranucca.

Achwiary možna addawać u Kamiteci Biełaruskaho T-wa p.p. ad w., Wilenskaja 33, 1, abo ŭ szkołach-achronkach: 1) Antokolskaja 23, 2) Bernardynski 12, 3) Ostrobramskaja 12, 4) Sw.-Jurski 44,18 i 5) Wiasiołaja 37—u czasi nawuki (ad 8 da 12 hadz. ranicaj).

× **Biełaruskaje T-wo pomaczy paciarpieuszym ad wajny** za miesiac kastrycznik wydało ŭ Wilni 4739 darmowych abiedoŭ, u tym liku wuczniam szkoł i achronak biełaruskich—4243 abied, druhim asobam (stałym i dzieciam) 496 abiedoŭ.

× **Pomacz Litwie.** Jak danosić «Dabartis», u Ameryce prezydent Wilson daŭ pazwaleńnie zrabić pa ŭsiej staranie adnadnieŭny zbor na pomacz Litwie. Zbor hety pawinien byŭ adbycca hetymi dniami.

× **Biełaruski** teatr. Spektakl u minuŭszuju niadzielu («U zimowy wieczar» i «Michałka») prajszoŭ udaczna. Padrobnuju sprawozdaczu damo ŭ czarodnym numery.

× **Niamieckije žurnalisty.** U swajej padarožy pa Biełarusi i Litwie Wilniu adwiedała druhaja partija niamieckich žurnalistoŭ. Miž inszym, jany ahledali wystaŭku rabotnych damoŭ.

× **Patrebny padwody.** Hradanaczalnik szukaje churmanoŭ na służbu u Hradanaczalstwie dziela wozki bulby. Treba mieć akuratny woz sa skryniaj i adnaho abo paru silnych kaniej. Paźniej patrebny buduć sani. Raboty budzie na tydni abo miesiacy. Aprycz poŭnaho utrymańnia churmana i kania i biezpłatnaho remontu za raboczy dzień płacicimuć 2 m. 50 fen. Zapisywacca treba u Hradanaczalnika, pakoj 65.

× **Znaczna pawyszeny** ceny na spirtnyje napitki, liczuczy ad 1 listapada.

× **Herbowy zbor.** Zakon ab herbowym zbory ŭstupaje ŭ siłu 15 listapada. Dakumenty, katoryje napisany pierad hetym dniom, herbowym zboram nie apłaczywajucca. Z hetaho wykluczajucca arendnyje umowy i strachawyje umowy i polisy, pawodłuh katorych treba apłacić zbor, liczuczy ad 15 listapada.

Aprycz taho herbowy zbor treba płacić pry pieredaczy prawoŭ i pretensij. Tut zbor stanowić $^1/_5$ pracenta ad wartaści pieredawanaho prawa ci pretensii. Za naznaczeńnia wuczycieloŭ i uradnikoŭ (czynoŭnikoŭ) płocicca zboru 3 marki. Za wydaczu dakumentoŭ i wypiski z ich, kali heta robicca na prośbu prywatnych asob, płocicca 3 m. Na zawiereńniach ułaściami podpisoŭ, pierekładoŭ i t. p. nakleiwajecca herbowaja marka canoj 3 m. Za zaćwierdžeńnie statutoŭ nowa-ładženych tawarystw (aprycz relihijnych, ahulna-karysnych i dabraczynnych) — 30 m. Pry umowach ab kupli i pradažy z licytacii nieruchomaho mieńnia płocicca herbowaho zboru 1 prac., ruchomaho — $^1/_2$ prac., a pry umowach ab pradažy tawaroŭ— $^1/_{10}$ prac.

× **Hod upraŭleńnia Ober-Ost.** 4 listapada minuŭ hod ad czasu orhanizacii upraŭleńnia Ober Ost. Ziemli upraŭleńnia OberOst abszaram 112.000 kw. kilometroŭ s 3 miljonami 4 tysiaczami žycharoŭ atrymliwajuć usie prykazy i zahady ad Hłaŭnakamandujuczaho na Uschodzi, jak ad najwyszejszaj prawodaŭczaj, sudowaj i spaŭnicielnaj ułaści — pa zahadu niamieckaho Impieratara.

× **Apawieszczeńnie.** Dziela zaszczyty ad mahczymych nalotoŭ samalotoŭ worahoŭ žychary haspod, katoryje aświetlajucca gazam abo elektrycznaściu s prywatnych stancij, pawinny ŭ pamieszczeńniach, dzie jość świetło, zasłanić wokny hetak szczylna, kab praz ich zusim nie wychadziŭ świet.

Č czytajecca, jak CZ; Š—jak SZ

Maksim Horecki.

Nasz teatr.

(Hl. № 76 „Homana“).

I my pawinny sami smakawać i ludziej častawać swajej narodnaj pieśniaj. I tut mnie prypaminajecca zwiertańnie dziadźki Ramanawa da „dščeriej biełorusskich“, katorych ciapier mnoha siarod wučycielak, kursistak: čamu-ž nie piajuć piesień narodnych pad muzyku fortepjano, skrypki i t. d.? A ŭžo patym budziem my pieć twory našych pieśniaroŭ, pakładzienyje na noty, bo ja widzieŭ, jak na niekolki socien ludziej u sali zrabiła bolšaje ŭražeńnie i bolš padchapiła naša „Čačotačka“, čymsia „A chto tam idzie?“ dajže hetkaja hłybokaja pa dumcy pieśnia, ale na škodu s trudnaj muzykaj i nialubymi trochu prastacie-biełarusu zakručenymi zwarotami mowy („na ŭ krywi nahach“...) Bo, kab zachapić hetkaju pieśniaj, jak pryhožaj pieśniaj, treba być nie aby jakim śpiewakaj i mieć u dušy światy ahoń, a ščyra-biełaruski matyŭ „Čačotki“ sam siabie abaronić.

IX.

Sto sabie dumajuć tyje z našych piśmiennikoŭ, što sypluć wieršyk za wieršykam i, majučy zdolnaść da bolš ważnaj i surjoznaj raboty ŭ piśmienstwi (ab čym haworuć inšyje z ichnych wieršaŭ) nia chočuć šyrej pahladzieć na swajo značeńnie dla Baćkaŭščyny i zabywajucca na swaju pawinnaść prad joju — rabić tak, kab pot wychadziŭ? Braty! dawoli ŭžo, dosi wam zachadzicca pa pływučaj, zwyčajna niehłybokaj, sučasnaj polskaj i rasiejskaj literatury i używać niezdarowaho i niamajučaho karyści dla rodnaho boku peckańnia papiery! Nie traćcia hroŝy na dziesiaci-hrašowyje žurnały pakalečenaho žanra, a hadujciesia na čytańni klasykoŭ i ŭdychajcia śwížaje pawietre narodnaj paezii, paznawajcia pryhožaść hetaj paezii, a, majučy ŭ sabie kareni hetaj paezii, tčycia praŭdziwa-mastackije uzory biełaruskaho žyćcia. Pracujcia piarom tak, kab twory wašy krasawalisia na počesnym miejscy ŭ bahataj kwatery intelihienta-biełarusa i znachodzili-b ščyraje spatkańnie pad samaj biednaj streškaju małamožnaho sielanina. Zamiest taho, kab napisać adzin ładny wierš, a ŭ śled puścić dziesiać drennieńkich s pierahukami ab tym samym, pracujcia lepi, naprykład, nad dramatyčnym tworam dla narodnaho teatru.

Piśmienniki biełaruskije! pakłapaciciesia ab tym, kab teatr naš zdawoliŭ mnohamožnaho i babyla, haradzkoha čeławieka i dzierawienskaho, staroha i małoha..

A najskarej dawajcia strawu tym, što pračnulisia, i tym, što ŭstajuć ješče: jany pojduć na rabotu, dyk jeści chočuć, — padkreplajcia ich.

Hadujcia našu nadzieju—dzietak našych.

Niasicia jadu biednamu Narodu, što praz cełyje wiaki znajeć i haworyć dwa słowy: „Ja hałodzien!“ Karmicia jaho chlebam, bo jon widzieŭ adny kamieńnia.

Šukajcia bratu swajmu darohu da praŭdy i pamiatajcia: nia budziecie wy šukać jaje, abo staniecie drenna šukać, aby jak,—Boh was pakarajeć.

A narod usio-ž t-ki znojdzieć swaju praŭdu, bo sam Chrystos skazaŭ, što „ałčuščyje praŭdy nasyciacca“.

(Kaniec)

U-wa ŭsich inszych damoch wokny kwater, dzie haryć świetło, pawinny być pawodłuh mahczymaści zakryty wakienicami abo ciomnymi zasłonami. Za narusześnnia hetaho budzie karać.

Wilna, 1 listapada 1916 h.

Der Deutsche Stadthauptmann
Pohl.

× **Apawieszczeńnie.** Žychary wielmi czasta pry ruchu na wulicach nie akazwajuć należnaj uwahi wajennym. Ja napaminaju niżejpisany, ŭžo raniej wydany zahad:

Usiudy treba dawać u swoj czas darohu, zychodziaccy naprawo. Na trotuarach zwyczajna nie pawinny iści bolsz dźwiech cywilnych asob pobocz. Z lewaho boku treba zaŭsiody pakidać hetulki miejsca, kab možna było pierehnać iduczych, nie zychodziaczy z trotuaru. Zatrymliwacca na trotuarach sroha zabaronieno. Za narusześnnie hetaho karacimuć sztrafam hrašmi da 1000 marak, abo wastroham da 6 miesiacoŭ.

Wilna, 1 listapada 1916 h.

Der Gouverneur
von Alten,
Generalleutenant.

× Apawieszczeńnie.

P. Hłaŭnakamandujuczyj armijej u tym miesiacy nałažyŭ kontrybuciju na niżejpisanyje hramady ŭ etapnaj terytoryi:

1. Na hramadu Rudziany, marjampolskaho paw.—600 m. za toje, szto jana, naruszajuczy zabaronu, pamahała ŭciokszym rasiejskim wajennym, dajuczy im spažyŭnyje pradukty;
2. Na hramadu Piłatyszki, marjampolskaho paw.—300 m. za toje, szto jana, naruszajuczy zabaronu, pamahała ŭciokszym rasiejskim wajennym, dajuczy im spažyŭnyje pradukty;
3. Na hramadu Gudele, marjampolskaho paw.—400 m. za toje, szto jana, naruszajuczy zabaronu, pamahała ŭciokszym rasiejskim wajennym, dajuczy im spažyŭnyje pradukty;
4. Na hramadu Gudele, marjampolskaho paw.—100 m. za toje, szto nia spoŭniła zahadu: „wajennuju apratku i rysztunak treba addawać";
5. Na hramadu Iwaszki, sejnenskaho paw.—500 m. za toje, szto jana, nia hledziaczy na zabaronu, paddzieržywała rasiejskich wajennych, dajuczy im pradukty;
6. Na hramadu Korkožy, władysławoŭskaho paw.—500 m. za toje, szto 15.X.1915 h. u Korkožach zhareło humno z zapasami zbožža i jość krepkaje padazreńnie, szto tut byŭ padpał, i winawajcu treba szukać miž czlenami hramady.

E. H. O. 1 listapada 1916 h.

Der Etappeninspekteur,
padp. Madlung,
Generalleutenant.

× **Kurs rubla.** Oficyalny kurs—1 m. 90 f.; u bankach za rubiel pry pradažy dajuć 1 m. 96 fen., pry kupli—2 m.

Pazyczkowaja kasa biare 6%.

Z USIAHO KRAJU.

Biełastok adžywaje.

BIEŁASTOK. Zahadam naczalnika upraŭleńnia ŭ Biełastoku fabrykam, katoryje karystajuć z elektrycznaj enerhii, jak siły, hadziny raboty naznaczeny ad 6 da 12 i ad 1 da 4 hadz. Ahraniczyć hadziny raboty pryszłosia zatym, szto elektrycznaja stancija nia zdužaje zdawolić usiej patreby elektrycznaj enerhii.

Heta najlepiej pakazwaje, jak užo padniałasia pramysłowaść i tarhoŭla ŭ Biełastoku.

Patajny brawar.

BIEŁASTOK. Na Sofijskaj wul. d. № 17, maładaja dziaŭczyna i chłapiec naładzili patajny brawar. Jana tłumaczyłasia tym, szto nia wiedała ab zabaronie hnać harełku. Paśla pryznałasia, szto krychu ab hetym czuła, ale szto zabarona — hetkaja surjoznaja, tabo nia wiedała. Jana kaže, szto brawarniczyła patajna zatym, kab prakarmić swajho chworaho baćku.

Kražy droŭ.

HRODNA. U apošnich czasach aresztawali mnoha ludziej, prabawaŭszych kraści drowy z kazionnaho składu na bierazi Niomana.

Za ukrywańnie strelby i miedzi.

LIDA. Upraŭlajuczyj Jan Bołondź, zasudženy akružnym sudom za gwałt i ŭzłom, sudziŭsia za ukrywańnie myśliŭskaj strelby i niezajaŭku miednaj pasudy, katoryje znajszli schawanymi u chlewi. Jon zasudžen na 5 hadoŭ u papraŭczy dom.

Ubiŭstwo.

LIPNIKI (kala Berszt). Adnaho tutejszaho sielanina banda razbojnikoŭ zabiła ŭ naczy, ababraŭszy jaho chatu. Pa im astałasia ŭdawa i kucza małych dziaciej.

Zmahańnie z woszami.

SUWAŁKI. Zmahajuczysia z woszami, upraŭleńnie Ober Ost dajszło taho, szto nima wialikaho pasiołka, dzie nie było by punktu dla niszczeńnia woszy. Za apošni czas atkryty nowyje punkty dla uhulna, ho užytku ŭ Suwałkach, Wižojnach. Filipowie, Bakałažewie i Sidorach.

WIESTKI Z RASIEI.

—з—

Radosławow ab separatnym miry.

SOFIJA. Minister-prezydent Radosławow skazaŭ adnamu žurnalistu miž inszym, tak:

„Rumynija ŭžo ciapier, papraŭdzi, ntraciła swaju niezaležnaść. Užo ciapier u hetym kraju haspadarać rasiejski cenzor i rasiejski palicejski.

„Czutkam ab separatnym miry nielha dawać wiery. Rasieja papała ŭ sieci Anhlii i nia maje mahczymaści pastupić niezaležna. Z hetaj pryczyny ab miry možna budzie haworyć tolki tady, kali da hetaho Rasieju prymusić wajennaje pałažeńnie. Usie świadomyje ludzi ŭ adzin hołas pryznajuć, szto 1917 hod daść razwiazku wajny".

Ważnaja narada.

CURYCH. Jak pisze „Now.Wr.", car zahadaŭ, kab usie pasły sajuznych hasudarstw sabralisia u hłaŭnaj kwatery na ważnuju naradu. Anhlicki pasoł Bakjanen užo prybyŭ u hłaŭnuju kwateru.

PARYŽ. U hłaŭnaj kwatery adbywajecca wajennaja narada, na kataraj jość car, brytanski pasoł u Pieciarburzi i rumynski hłaŭnakamandujuczy Awereskau.

Rasiejskaja kamanda ŭ Dobrudžy.

ŽIENIEWA. Rasiejskuju wyszejszuju kamandu adabrali ad hienerała Zajonczkaŭskaho(?) i jaje addali hien. Sacharowu.

Mikałaj Mikałajewicz wiertajecca(?)

SZTOKHOLM. Hazety z pałudziennaj Rasiei ŭ adzin hołas piszuć, szto Mikałaj Mikałajewicz budzie iznoŭ naznaczen wiarchoŭnym hłaŭnamandujuczym usich rasiejskich sił. «Odesskaja Rieczj» pisze, szto car zamaryŭsia ad biezupynnaj pracy i, žywuczy u hłaŭnaj kwatery, zachwareŭ. Usio ž taki pa imi car budzie i dalej liczycca wiarchoŭnym hłaŭnakamandujuczym, ale u jaho budzie pamocznik z nadta wialikaj ułaściu.

Sanitarnaja pomacz.

BERGEN. U apošnije dni cieraz Bergen u Rasieju wyjechała wialikaja francuskaja ambulatoryja za 100 asob. Jany adhetul pajeduć u Rumyniju, dzie wielmi niechwataje pierewiazacznych materjałoŭ.

U Bergen prybyło 30 siostr miłaserdzia, katoryje cieraz Anhliju jeduć u Sałoniki.

Palitycznaja nieudaana.

SZTOKHOLM. „Now. Wr." ŭ doŭhaj stacci haworyć ab nowym palitycznym kursie ŭ Japonii, kažuczy, szto nowy minister-prezydent Terauczy, jak dawiereny wajennaj partii, wystupaje razka proci Kitaju i starajecca paszyryć miežy ŭpływoŭ Japonii koštam Kitaju. Rasieja prabawała pamieszyć japonskije žadańnia ad Kitaju, ale nie spatkała ŭ Japonii achwoty iści na spatkańnie hetaho. Heta liczać za nieudaczu rasiejskaj palityki.

Zajawa Protopopowa.

SZTOKHOLM. Na apošnim zasiedańni biudžetnaj kamisii Dumy na niaŭczenyje napaści deputatoŭ Protopopow adkazaŭ pramowaj, haworaczy: «Ja zawieraju was, panowie deputaty, szto ja maju takoje-ž žadańnie dajści praŭdy, jakoje zdziajusia znajści ŭ was. Usie ciapierasznije ŭražeńnia zaciraje ahulnaja bieda, katoraja ustrasaje asnowy naszaho ekonomicznaho žyćcia z pryczyny spyniŭszajsia abmieny tawarami». Protopopow prajektuje zrabić z Rasiei palicejskaje hasudarstwo na takich asnowach, kab na kožnaje 400 dusz prypadaŭ adzin palicejski. Dalej, na jaho dumku, ŭsiu Rasieju treba pabić na palicejskije okruhi upraŭleńnia, abnimajuczy ŭ miestoch 30.000 dusz, a ŭ wioskach—4.000. Administracyjnuju palicyju, katoraja wiadzie sprawy paszpartoŭ i lehitymacij, treba zrabić zusim niezaležnaj.

Žoŭtaja chwała.

SZTOKHOLM. U wakolicach Helsingbora pracuje 20,000 kitajcoŭ.

Z usiaho świetu.

Bawarski Karol ŭ Aŭstryjackaj Ukrainie

LWOŬ. 4 listapada tut byŭ karol Ludwik Bawarski.

Parlamenckije wakacii.

BERLIN. Niamiecki parlament adłažyŭ swaje zasiedańnia da 13 lutaho 1917 hodu.

Druhaja padaroža „Deutschland".

BERLIN. Niamieckaja padwodnaja łodka „Deutschland", katoraja raz užo była ŭ Amerycе i szczaśliwa wiarnułasia nazad, prybyła tudy druhi raz.

Proci wajenszczyny.

MELBURN. Pry narodnym hałasawańni u Aŭstralii ab ahulnaj wajennaj słužbie prajekt hety adkinut pierewahaj 887 tysiacz hałasoŭ proci 798 tysiacz. Minister-prezydent Hygs z hetaj pryczyny padajecca ŭ adstaŭku.

Pratest rabotnikoŭ.

MONREAL (u Kanadzie). Rabotnickije orhanizacii padali pratest u Kamisiju dziela nacyonalnaj służby proci pramysłowaj rehistraci, jak sposabu dziela zawiadzieńnia ahulnaj wajennaj pawinnaści, bo hetaja rehistracija była-by ahraniczena tolki rabotnikami.

Z Watykanu.

RYM. Kardynał - dyakon della Wolpe, prefekt kongregacii Indeksu, pamier, majuczy 74 hady.

ŽIENIEWA. Pierehawory boŭharskaho prawicielstwa z Watykanam ab wyznaczeńni pasolstwa pry Św. Tronie skonczylisia udaczna. Papież skora ustanowić u Sofii nuncyaturu.

Ahrableńnie świątyń u Italii.

BAZEL. Italjanski urad pryhataŭlaje dekrety ab addaczy hasudarstwu kaścielnaho mieńnia, klejnotoŭ i cennych daroŭ.

Ziamlitrasieńnie u Armenii.

CURYCH. U rezydencii armianskaho katolikosa ŭ Eczmiadzinie było wielmi siłnaje trasieńnie ziamli, chwali katoraho iszli z uschodu na zachod. Narod spałochany hetym wybiehaŭ na wulicy. U sabory zrabilisia treszczyny. Z akaličnych sioł danosiać ab znacznych szkodach.

TELEHRAMY.

Niemieckije apawieszczeńnia.

Front erc-hercoga Karola: U paŭnocznaj czaści Siemihradzii na adrezku Teldjes rasiejcy dajszli miejscowych udacz. Na pałudziennym fronci usniaŭszyjesia ŭczora bitwy miž Alt-Szanc i darohaj cieraz prachod Bodža trywajuć dalej. Wiarszyna Roska ŭziata nami nazad. Zdabyŭszy szturmam Kłoabocetu Bajului, my dapoŭnili naszy udaczy pry Predeal. Wielmi krepka umacawanaja pazycija Kłoabocetu, katoruju worahi baranili nadta ćwiorda, astałasia ŭ naszych rukach. Złuczsenyje wojski, liczuczy razam z 14 ŭziatymi ŭczora aficerami, ŭ tym czyśle 1 pałkoŭnikam, i 647 sałdatami, usiaho ŭziali ŭ pałon 1747 rumynoŭ, 8 harmat i 20 kulemiotoŭ. Paradkujuczy pole bitwy na paŭnocznym zachodzi ad Kampołunga, na adnym tolki adrezku miž Argesului i dalinaj Targului pacharonieny kruhłym czysłom 1000 rumynoŭ. U razwiwajuczajsia atacy na pałudziennym uschodzi ad Czyrwonaj Baszni i ŭ pabiednych bitwach na zachodzi ad prachodu Szurduk z uwarwaŭszymisia siudy rumynskimi atradami my ŭziali bolsz za 150 pałonnych.

Bałkanski teatr:

Front Makiensena: Konstancu i Mangaliju abstreliwali z mora. U Konstancy zrobleny szkody. Bierehawoj artyleryjej i atakami naszych latunoŭ marskije siły woraha byli prymuszeny adyjści.

Makiedonski front: Biez nijakich prypadkoŭ.

Austryjackije apawieszczeńnia.

WIENA. 3.XI. Uschodni teatr: Front erc-hercoga Karola: U paŭnocznaj Wałachii rumyny ŭczora

atakawali szmat u jakich miescoch. Jany ůsiudy adbity. Honiaczy worahoů, naszaje wojsko iznoů dajszło udaczy na pałudziennym uschodzi ad prachodu Czyrwonaj Baszni i na pałudziennym uschodzi ad Predeal. Na ůschodnim siemihradzkim fronci i ů lasistych Karpatach bajewaja rabota była nieznacznaja.

Front Leopolda Bawarskaho: Pry Bystrycy Sołotwinskaj—bitwy piarednich atradoů. Usie szturmy worahoů złomleny z samymi ciažkimi ů ich stratami.

Italjanski teatr: Na prymorskim fronci ůczora iznoů iszli niezwyczajna wostryje bitwy. Marnujuczy biaz miery ludziej i wajennyje materjały, italjancy dalej wiali swaje szturmy. U dalinie Wippacha proci naszych pazycij iznoů iszli wostryje szturmy. Worahoů ůsiudy možna było adkinuć. Na płoskahoryi Karst italjancy na adrezku Łokwicy zrabili nowy massowy udar, katory iszoů cieraz wiarszynu Pieczynka i ůzdoůž darohi Kostanjeniko. Udar hety my strymali, zrabiůszy woraham samyje ciažkije straty. Pry hetym dźwie batarei, stajaůszyje da kanca, ů katorych usie ludzi i koni byli zabity, papali ů ruki worahoů. U pałudziennaj czaści płoskahoryja ůsie ataki worahoů złomleny. Czysło pałonnych italjancoů dajszło da 2.200 dusz.

WIENA. 4/XI. Uschodni teatr: (hl. niamieck. apaw.)

Italjanski teatr: Pasla ciažkich bitw 1 i 2 listapada pierszaja pałowa dnia 3 listapada pajszła biez znaczniejszych wajennych operacij. Pa-abiedzi, adnak, rabota italjancoů iznoů uzmacawałasia. Na płoskahoryi Karst nowyje sproby italjancoů szturmawać byli adbiwany ahniom artyleryi. Worahi nidzie nie mahli niczoha dajści. U dalinie Wippacha ů wieczary wialikije siły worahoů uwarwalisia na naszy pazycii pry Wertojbie i Biełaj. Kontratakami ůsie akopy ůziaty ůraz-že nazad. Pierad zaharadziami pry S. Kataryna i Dember, daremna szturmujuczy, raskrywaůleny niekolki bataljonoů bersagljeroů.

A 1 listapada czysło pałonnych uzrasło da 3.500 dusz.

WIENA. 5.XI. Uschodni teatr: (hl. niamieck. apaw.).

Italjanski teatr: Na płoskahoryi Karst italjancy swaje siły kirawali hłaůnym czynam na pałudziennuju czaść płoskahoryja. Centram bitwy hetym razam byli wakolicy Jamjano; ad samaj ranicy naszy akopy tamaka stajali pad silnym abstrełam, katory pierad kožnym nastupleńniem piachoty uzmacowywaůsia. Usie ataki, asabliwaž aposzniaja, paczaůszajasia a 8 hadz. wieczera, złomleny pierad naszymi linijami z wielmi ciažkimi stratami u worahoů. U inszych punktach bajewoha frontu artyleryjskaja bitwa trywała z niazmienszenaj siłaj.

Rasstreł swaich.

BERLIN. (W.T.B.). Spamiž žycharoů zaniatych bielhijskich i francuskich ziamiel u akciabry ahniom artyleryi i skinutymi worahami bombami zabity 37 mužczyn, 16 žanok i 15 dziaciej, ranieny 67 mužczyn, 55 žanok i 43 dziaciej. Hetak ahulnaje czysło achwiar s pamiž cywilnych žycharoů ad wieraśnia 1914 hodu uzrasło da 2.348 dusz.

Straty anhiiczan na Sommie.

BERLIN. Pawodłuh „Daily Telegr.“ anhlickije straty dachodziać: u kastryczniku — 4,368 aficeroů i 102,340 sałdatoů, u wieraśni—5,408 aficeroů i 113.780 sałdatoů. u žniůni—4,693 aficery i 125,097 sałdatoů.

Pahibiel anhlickaho krejsera.

BERLIN. (W.T.B.). 23 kastrycznika adna z naszych padwodnych łodak na zachodzi ad Irlandii zatapiła mały anhlicki krejser staraha typu z dwoma kominami.

Zniszczen rasiejski bronienosiec(?)

KOPENHAGA. Adzin szwedzki kupiec, wiarnuůszysia z Rasiei — z Finlandii, apawiedaje, szto bronienosiec „Siewastopol“ 8 dzion tamu nazad naskoczyů pry Helsingborge na minu i ciažka papsowan.

Rumynski optymizm.

LONDON. «Times» danosić z Bukaresztu:

«Pałažeńnie na karpackim fronci —pamyšnaje. Važniejszyje prachody dobra umacawany. U Karpatach užo poůnaja zima. Wakolicy Dunaju nawodnieny.

Razrucha u Hrecii.

PIECIARBURH. „Now. Wr.“ daje zrazumieć, szto narada sajužnikoů u Bułoni admowiłasia słuchać wajennaj prahramy Bryana. Anhlija, Rasieja i Italija, z pryczyny poůnaj nieudaczy rewolucyjnaho ruchu Wenizelosa i operacij u Sałonikach, maniacca nie akazwać bolsz padzieržki „bałkanskamu kursu“ Bryana.

ŽENIEWA. Wenizelos zakazaů dla sałonikskaho miejscowaho pacztowaho ruchu marki z partretam Aleksandra Meliko.

AFINY. Pasły sajužnikoů pastanawili ustanawić hranicznuju liniju miž afinskaj i sałonikskaj Hrecijej, kab niedapuścić zmahańnia miž abiedźwymi czaściami.

AFINY. (Reůter). Admirał Fernes zažadaů ad hreckaho uradu zhody na wydaczu lohkich marskich hreckich sił i pamiaszczeńnie na ich francuskich ekipažoů. Rada ministroů pad marszałkoůstwam karala pastanawiła žadańnie admirała adkinuć, bo, spaůniajuczy jaho, była by naruszena neutralnaść Hrecii.

Spis wajena-pałonnych z naszaho kraju.

Z Wilni i Wilenskaj hubernі.

Tabor dla wajenna-pałonnych Aschaffenburg.

Antraproc Kazimir, Lida.
Abramowicz Iwan, Oszmiana.
Barkoůski Bronisłaů, „
Jeskiewicz Franc, Swienciany.
Gurszkin Siamion, Oszmiana.
Kolmatowicz Adolf, Swienciany.
Kancewicz Maksim, Lida.
Płaůko Iwan. Wilnia.
Ślapowicz Zyhmunt, „
Wyrwicz Michał, Barsuki.
Paniewicz Afis, Aziorki.
Polak Stanisłaů, „
Gieniewicz Wincenty, Maładeczna.
Aůtuch Iwan, Broduliszki.
Barowaski(?) Feliks, Wilnia.
Baranoůski Feliks, Wilnia.
Muraszka Dzimitr, Horodzieniec.

Drukawana u drukarni M. Kuchty. Wydawiectwo «Homan». Redaktar W. Łastoůski.

Незвычайны дадатак Цэна 5 фэн. (3 кап.)

ГОМАН

БЕЛАРУСКАЯ ВІЛЕНСКАЯ ЧАСОПІСЬ

ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ У ТЫДЗЕНЬ: У АЎТОРКІ І ПЯТНІЦЫ

Вільня, 5 лістапада 1916 г.

З ВАРШАВЫ тэлеграфуюць:

Да жыхароў Варшаўскаго Генерал-Губэрнатарства.

Яго Вялічэство Нямецкі Імператар і Яго Вялічэство Імператар Аўстрыі, Апостальскі Кароль Вэнгрыі, кіруючыся цьвёрдай верай у канечную перамогу свайго аружжа і жаданьнем вясьці па-сустрэч счасьлівай будучыне **Польскі Край**, вырваны іх адважнымі войскамі с цяжкімі ахфярамі с-пад расейскаго панаваньня, згодзіліся на тым, каб з гэтых зямель стварыць **незалежную** дзержаву з **дзедзічнай монархіей і конституцыйным ладам**. Акуратнае вызначэньне граніц Каралеўства Польшчы адбудзецца пазьней. Новае Каралеўство, прылучаючыся да абедзьвых саюзных дзержаў, знойдзе паруку, патрэбную яму дзеля вольнаго развіцьця сваіх сіл. **У яго арміі** будуць далей жыць слаўные традыціі польскіх войск з даўных часоў і успаміны аб адважных польскіх паплечніках з вялікай вайны цяперашняго часу. Яе лад, шых і кіраўніцтво будуць нарыхтаваны з агульнай згоды. Саюзные монархіі маюць поуную надзею, што жаданьне дзержаўнаго і нацыональнаго развіцьця Каралеўства Польшчы цяпер будуць споунены з належнай увагай на агульные палітычные варункі Эуропы і на дабрабыт і баспечнасць іх уласных зямель і народоў. А суседніе с Каралеўствам Польшчай вялікіе заходніе дзержавы з радасьцю будуць бачыць на сваей усходняй граніцы будову і расьцьвет вольнаго, шчасьліваго і радаго са свайго нацыональнаго жыцьця гасударства.

Паводлуг Найвышэйшаго загаду Яго Вялічэства Нямецкаго Імператара
ГЕНЭРАЛ-ГУБЭРНАТАР
ф. БЭЗЭЛЕР.

Вышэйпісаны маніфэст дае развязку будучыны нацыональна-польскіх зямель, каторые раней былі пад панаваньнем Расеі. Пытаньне аб будучыне літоўскіх жыхароў маніфэстам не закрануто: яно будзе развязано толькі пазьней. Аднак, факт, што пад нямецкай окупацiей наладжэно упраўленьне Літвы, ясна паказвае, што Нямеччына хочэ захаваць і спагадліва аднасіцца да асобнасьці літоўскаго насяленьня. Нямеччына кіруецца да вольнаго развіцьця і справядліваго аднашэньня да ўсіх народоў. Калі літоўскае насяленьне будзе угледацца на гэты прынцып, пастаўлены ня толькі ў тэорыі, але і старанна стасаваны ў практыцэ нямецкаго окупацыйнаго упраўленьня, — то яно прыйме да свайго ведама цяперашнюю пастанову, прынятую дзеля адбудовы аўтономнаго Польскаго гасударства з расейскіх нацыональна-польскіх зямель, не турбуючыся аб сваім уласным шчасьлівым развіцьці.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтво «Гоман». Редактар В. Ластоўскі.

Niezwyczajny dadatak. Cena 5 fen. (3 kap.)

HOMAN

BIEŁARUSKAJA WILENSKAJA CZASOPIŚ

WYCHODZIĆ DWA RAZY U TYDZIEŃ: U AUTORKI i PIATNICY.

Wilnia, 5 listapada 1916 h.

Z WARSZAWY telehrafujuć:

Da życharoŭ Warszaŭskaho Hienerał-Hubernatarstwa.

Jaho Wialiczestwo Niamiecki Impieratar i Jaho Wialiczestwo Impieratar Aŭstryi, Apostalski Karol Wenhryi, kirujuczysia ćwiordaj wieraj u kaniecznuju pieramohu swajho arużża i żadańniem wiaści na-sustrecz szczaśliwaj buduczynie *Polski Kraj*, wyrwany ich adważnymi wojskami s ciażkimi achwiarami s-pad rasiejskaho panawańnia, zhodzilisia na tym, kab z hetych ziamiel stwaryć *niezaležnuju dzieržawu z dziedzicznaj monarchijej i konstytucyjnym ładam*. Akuratnaje wyznaczeńnie hranic Karaleŭstwa Polszczy adbudziecca paźniej. Nowaje Karaleŭstwo, pryłuczajuczysia da abiedźwych sajuznych dzieržaŭ, znojdzie paruku, patrebnuju jamu dziela wolnaho razwićcia swaich sił. *U jaho armii* buduć dalej żyć słaŭnyje tradycii polskich wojsk z daŭnych czasoŭ i ŭspaminy ab adważnych polskich paplecznikach z wialikaj wajny ciapierasznialho czasu. Jaje ład, szych i kiraŭnictwo buduć narychtawany z ahulnaj zhody. Sajuznyje monarchii majuć poŭnuju nadzieju, szto žadańnia dzieržaŭnaho i nacyonalnaho razwićcia Karaleŭstwa Polszczy ciapier buduć spoŭnieny z należnaj uwahaj na ahulnyje palitycznyje warunki Europy i na dabrabyt i baspiecznaść ich ułasnych ziamiel i narodoŭ. A susiednije s Karaleŭstwam Polszczaj wialikije zachodnije dzieržawy z radaściu buduć baczyć na swajej uschodniaj hranicy budowu i rasćwiet wolnaho, szczaśliwaho i radaho sa swajho nacyonalnaho žyćcia hasudarstwa.

Pawodłuh Najwyszejszaho Zahadu Jaho Wialiczestwa Niamieckaho Impieratara

Hienerał-Hubernatar

v. BESELER.

Wyszejpisany manifest daje raźwiazku buduczyny nacyonalna-polskich ziamiel, katoryje raniej byli pad panawańniem Rasiei. Pytańnie ab buduczynie litoŭskich žycharoŭ manifestam nie zakranuto: jano budzie razwiazano tolki paźniej. Adnak, fakt, szto pad niamieckaj okupacijej naładženo upraŭleńnie Litwy, jasna pakazwaje, szto Niamieczczyna chocze zachawać i spahadliwa adnasicca da asobnaści litoŭskaho nasialeńnia. Niamieczczyna kirujecca da wolnaho razwićcia i sprawiadliwaho adnaszeńnia da ŭsich narodaŭ. Kali litoŭskaje nasialeńnie budzie uhledacca na hety pryncyp, pastaŭleny nia tolki ŭ teoryi, ale i staranna stasawany ŭ praktyce niamieckaho okupacyjnaho upraŭleńnia, — to jano pryjmie da swajho wiedama ciapierasznuju pastanowu, pryniatuju dziela adbudowy aŭtonomnaho Polskaho hasudarstwa z rasiejskich nacyonalna-polskich ziamiel, nie turbujuczysia ab swaim ułasnym szczaśliwym razwićci.

Drukawana u drukarni M. Kuchty. Wydawiectwo «Homan». Redaktar W. Łastoŭski.